**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ**

Вучэбная праграма

па вучэбным прадмеце

# «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

для VI—X класаў

першага аддзялення дапаможнай школы

(дапаможнай школы-інтэрната)

з беларускай мовай навучання

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

**Мінск, 2016**

## Тлумачальная запіска

У аснове праграмы па беларускай мове для VI—X класаў ляжыць антрапацэнтрычная канцэпцыя навучання мове, у якой галоўным з’яўляецца выхаванне чалавека, які зможа практычна карыстацца мовай. Навучанне мове арыентавана на фарміраванне моўнай асобы — чалавека, які гаворыць, піша, чытае, успрымае. У сваю чаргу, магчымасці моўнай асобы ўспрымаць і прадуцыраваць маўленчыя выказванні залежаць ад яе маўленчых і разумовых магчымасцей. На першы план вылучаецца чатырохузроўневая маўленчая дзейнасць (аўдзіраванне, чытанне, гаварэнне і пісьмо), а асноўнай адзінкай навучання становіцца вусны і пісьмовы тэкст. Граматыка робіцца сродкам авалодання мовай ва ўсіх яе функцыях, што спрыяе фаміраванню камунікатыўна актыўнай асобы.

Навучанне беларускай мове, як і ў I—V класах, абапіраецца на наступныя тэарэтычныя падыходы:

– полікультурны (увядзенне дзіцяці ў свет агульначалавечых каштоўнасцей);

– кампетэнтнасны (авалоданне рознымі відамі камунікатыўнай дзейнасці);

– цэласна-сістэмны (вывучэнне мовы як сістэмы, узаемасувязь асноўных відаў маўленчай дзейнасці, інтэгратыўны характар навучання грамаце);

– дыферэнцыраваны падыход (улік пазнавальных магчымасцей, прыроды інтэлектуальнай недастатковасці).

Навучанне мове мае практыка-арыентаваны характар, што вызначаецца магчымасцямі і жыццёвымі патрэбамі навучэнцаў, у якіх на першым месцы стаяць практычныя навыкі карыстання мовай, і садзейнічае фарміраванню і развіццю жыццяздольнай, падрыхтаванай да самастойнага жыцця асобы навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Навучанне мове мае карэкцыйную накіраванасць, што прасочваецца як у карэкцыі фанетыка-фанематычнага і лексіка-граматычнага бакоў маўлення, так і ў фарміраванні адэкватных моўных паводзін.

Выкананне патрабаванняў праграмы садзейнічае развіццю ўсіх відаў маўленчай дзейнасці вучняў, фарміраванню ў іх камунікатыўных уменняў, увядзенню іх у свет беларускай мовы і літаратуры, азнаямленню з культурнай спадчынай беларусаў.

Пры навучанні мове зыходзяць з патрэб, інтарэсаў і магчымасцей вучняў: прапануюцца тэксты, блізкія да жыцця дзяцей і зразумелыя ім; вывучэнне моўнага матэрыялу разглядаецца не як самамэта, а як сродак для фарміравання ўсвядомленай маўленчай дзейнасці дзяцей; да вучняў даводзіцца неабходнасць валодання мовай у будучым самастойным жыцці, валоданне мовай разглядаецца як адна з важнейшых умоў сацыялізацыі выпускнікоў дапаможнай школы.

Матэрыял праграмы па беларускай мове забяспечвае авалоданне школьнікамі базавымі ўменнямі і навыкамі. Разам з тым праграмай не абмяжоўваюцца магчымасці вучняў у набыцці больш шырокіх ведаў па асобных раздзелах.

Праграма па беларускай мове пабудавана канцэнтрычна і ўключае вывучэнне наступных раздзелаў: «Маўленне», «Тэкст», «Сказ» «Слова», «Часціны мовы», «Гукі і літары». Уключэнне ў праграмны матэрыял першых двух раздзелаў абумоўлена камунікатыўнай арыентаванасцю вывучэння мовы, пры якой дзеці атрымліваюць элементарныя звесткі пра мову і маўленне, вучацца бачыць адрозненне гэтых паняццяў; тэкст жа разглядаецца як камунікатыўная адзінка, на матэрыяле якой адбываецца вывучэнне правіл граматыкі.

Пры вывучэнні раздзела *«Маўленне»* вучні даведваюцца пра ролю маўлення ў жыцці людзей, знаёмяцца з формамі і відамі маўлення, правіламі і сферамі карыстання вусным і пісьмовым маўленнем, дыялогам і маналогам.

Раздзел *«Тэкст»* знаёміць вучняў з тэкстамі розных тыпаў, вучыць адрозніваць тэкст ад групы сказаў, не аб’яднаных сэнсава; вылучаць тэму і асноўную думку тэксту, характарызаваць учынкі герояў; дзяліць тэкст на часткі; складаць план тэксту; усведамляць кампазіцыю і самастойна ствараць тэксты розных відаў і тыпаў, афармляць іх пісьмова.

У праграме па беларускай мове прыведзена прыкладнае размеркаванне гадзін па асобных раздзелах і тэмах. Настаўнік можа самастойна пераразмяркоўваць яго ў залежнасці ад магчымасцей вучняў.

Праграма дае шырокі прасцяг для праяўлення творчай ініцыятывы настаўніка, арыентуе яго на максімальнае выкарыстанне індывідуальных здольнасцей вучня.Яна з’яўляецца варыятыўнай. Дыдактычныя патрабаванні маюць два ўзроўні. Праграмны матэрыял, які не пазначаны, вывучаецца ўсімі вучнямі. Адносна больш складаны вучэбны матэрыял пазначаны ў тэксце праграмы знакам *(гэта так званы першы ўзровень). Спрошчаныя заданні адрасаваны вучням з нізкімі пазнавальнымі магчымасцямі, у праграме яны пазначаны знакам #і іншым шрыфтам (курсівам) (другі ўзровень).

## VI клас
## (105 гадзін, 3 гадзіны ў тыдзень)

**Уводзіны ў беларускую мову. Мова імаўленне**. Родная мова. Родны край (6 гадзін).

**Тэкст** (6 гадзін).Адрозненне тэксту ад групы сказаў, не звязаных паміж сабой па сэнсе. Прыметы тэксту. Загаловак тэксту. Тэма тэксту. Аўтар тэксту. Вызначэнне асноўнай думкі тэксту. Пераказ тэксту з 30—40 слоў па калектыўна складзеным плане.

Напісанне адраса на канверце, паштоўцы.

**Сказ** (16 гадзін). Агульнае паняцце пра сказ. *Тыпы сказаў паводле мэты выказвання: апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя. Клічныя і няклічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа: кропка, пытальнік, клічнік.

*Галоўныя і даданыя члены сказа і іх роля ў сказе. Дзейнік і выказнік.

*Сувязь слоў у сказе. Словазлучэнне.

*#Вылучэнне сказаў з тэксту. Упарадкаванне дэфармаванага сказа. Складанне сказаў па пытаннях. Вызначэнне, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе. Кропка ў канцы сказа. Вялікая літара ў пачатку сказа.*

**Слова. Значэнне слова** (4 гадзіны).Лексічнае значэнне слова. Слоўнікі беларускай мовы. Пераклад асобных слоў з рускай мовы на беларускую і наадварот.

Вялікая літара ва ўласных назвах (імёнах, імёнах па бацьку і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёр і іншых уласных назвах).

**Часткі слова** (14 гадзін).Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Агульная частка роднасных слоў — корань. *Канчатак як зменная частка слова, яго роля ў сувязі слоў у сказе. *Прыстаўка. *Суфікс.

**Часціны мовы. Назоўнік** як часціна мовы.Агульнае паняцце. Пытанні, на якія адказвае назоўнік. *Род назоўнікаў. *Змяненне назоўнікаў па ліках (10 гадзін).

Практычнае азнаямленне з **прыназоўнікам** (2 гадзіны).

**Прыметнік** як часціна мовы. Значэнне, пытанні. *Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у спалучэнні з назоўнікамі (8 гадзін).

**Дзеяслоў** як часціна мовы. Практыкаванні на знаходжанне дзеясловаў у сказах, тэкстах. *Правапіс ***не*** з дзеясловамі (6 гадзін).

**Гукі і літары** (24 гадзіны). Гукі і літары. Алфавіт. Галосныя гукі і літары. Зычныя гукі і літары. Мяккія, цвёрдыя, зацвярдзелыя зычныя. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я, ь***. Літары галосных, якія стаяць пасля літар цвёрдых і зацвярдзелых зычных. Правапіс ***д—дз, т—ц***. Звонкія і глухія зычныя. *Правапіс звонкіх зычных. Падоўжаныя зычныя. Раздзяляльныя знакі — апостраф і ***ь***. Правапіс ***у, ў***.

Склад. Падзел слоў на склады. Правілы пераносу слоў.

Націск. Правапіс ***о, э—а; е, ё—я***.

*#Гук і літара **ў**. Гук і літара **й**. Літара **ь**. Апостраф. Падоўжаныя зычныя. Склады. Націск. Перанос слоў.*

**Паўтарэнне вывучанага за год** (9гадзін).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VI КЛАСА:

Вучні ўмеюць:

адрозніваць гукі і літары, галосныя і зычныя гукі, цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя, звонкія і глухія зычныя, вылучаць падоўжаныя зычныя;

дзяліць словы на склады, пераносіць словы па складах;

пісаць з вялікай літары ўласныя назвы;

падбіраць роднасныя словы, вылучаць корань у групе роднасных слоў;

*знаходзіць у слове канчатак, прыстаўку, суфікс;

знаходзіць назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, якія стаяць у пачатковай форме, ставіць да іх пытанні;

*вызначаць род, лік назоўніка, прыметніка;

*#вылучаць сказ з тэксту; упарадкоўваць дэфармаваны сказ, вызначаць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, што гаворыцца; правільна афармляць сказ на пісьме;*

*адрозніваць сказы розных тыпаў, галоўныя і даданыя члены сказа;

*вылучаць у сказе словазлучэнні;

пісаць адрас на канверце, паштоўцы;

пісаць нескладаны пераказ невялікага тэксту аб'ёмам 30—40 слоў;

пісьменна і каліграфічна правільна пісаць пад дыктоўку тэкст (*40—45 слоў, *#20—25 слоў*) з вывучанымі арфаграмамі і знакамі прыпынку ў канцы сказа *(#кропкай у канцы сказа).*

**VII клас**

**(105 гадзін, 3 гадзіны на тыдзень)**

**Паўтарэнне** (8 гадзін). Гукі і літары. Алфавіт. Галосныя гукі і літары. Зычныя гукі і літары. Мяккія, цвёрдыя, зацвярдзелыя зычныя. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я, ь***. Літары галосных, якія стаяць пасля літар цвёрдых і зацвярдзелых зычных. Правапіс ***д—дз, т—ц***. Звонкія і глухія зычныя. Падоўжаныя зычныя. Раздзяляльныя знакі — апостраф **(')** і ***ь***. Напісанне слоў з ***ў***.

Склад. Падзел слоў на склады. Правілы пераносу слоў.

Націск. Правапіс ***о, э—а; е, ё—я***.

Сказ. *Тыпы сказаў паводле мэты выказвання і эмацыянальнай афарбоўкі.

*#Вылучэнне сказа з тэксту, упарадкаванне дэфармаванага сказа. Вялікая літара ў пачатку сказа. Кропка ў канцы сказа.*

**Маўленне** (4 гадзіны). Агульнае паняцце. Адрозненне мовы і маўлення. Вуснае і пісьмовае маўленне. Паняцце пра дыялог.

**Тэкст** (8 гадзін). Прыметы тэксту. Вызначэнне асноўнай думкі тэксту.

Структура тэксту: пачатак, асноўная частка, заключная частка. Сувязь паміж часткамі тэксту. Пераказ тэксту па калектыўна складзеным плане. *Складанне апавядання на дадзеную тэму па апорных словах і словазлучэннях, па пачатку або канцоўцы апавядання.

Напісанне віншавальнай паштоўкі, ліста родным, тэлеграмы, СМС-паведамлення.

**Сказ** (15 гадзін). *Агульнае паняцце пра просты сказ. Афармленне сказа на пісьме. Тыпы сказаў. Просты неразвіты і развіты сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік. Устанаўленне сувязі паміж словамі ў сказе. Словазлучэнне. Пераклад словазлучэнняў з беларускай мовы на рускую і наадварот. Складаны сказ: агульнае паняцце. Коска паміж часткамі складанага сказа.

*#Апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя сказы. Клічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа.*

*Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік. Даданыя члены сказа.*

**Слова** (20 гадзін). **Лексічнае значэнне слова.** Словы з блізкім і процілеглым значэннем.

**Часткі слова.** *Корань як агульная частка роднасных слоў. Канчатак. Прыстаўка. Суфікс. Адрозненне формы слова ад новага, роднаснага слова. Правапіс галосных і зычных у корані слова. Правапіс прыставак ***пад-, над-, ад-, аб-, перад-***. Апостраф пасля прыставак.

*#Роднасныя словы. Часткі слова. Корань. Канчатак. Прыстаўка. Суфікс. Правапіс* ***о, э—а; е, ё—я***.

**Часціны мовы.** Агульнае паняцце. Вызначэнне, да якой часціны мовы адносіцца тое або іншае слова (2 гадзіны).

**Назоўнік** (20 гадзін). *Род і лік назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў у спалучэнні з іншымі словамі. Склоны і склонавыя пытанні назоўнікаў. Скланенне як змяненне назоўнікаў па склонах.

*#Змяненне назоўнікаў па ліках. Род назоўнікаў.*

**Прыметнік** (10 гадзін).*Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у спалучэнні з назоўнікамі. Канчаткі прыметнікаў ***-ы, -і, -ая, -яя, -ое, -ае, -яе, -ыя, -ія***.

*#Род і лік прыметнікаў, залежнасць гэтых катэгорый ад роду і ліку назоўніка, з якім прыметнік звязаны па сэнсе.*

**Дзеяслоў** (10 гадзін).*Змяненне дзеясловаў па часах: прошлым, цяперашнім, будучым.

*#Агульнае паняцце пра дзеяслоў. Правапіс* ***не*** *з дзеясловамі.*

**Паўтарэнне вывучанага за год** (8 гадзін).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VII КЛАСА:

Вучні ўмеюць:

вылучаць часткі слова, падбіраць роднасныя словы;

*адрозніваць формы слова ад новых роднасных слоў;

вызначаць, да якой часціны мовы (з вывучаных) адносіцца прапанаванае слова;

вызначаць род, лік назоўніка і прыметніка; *склон назоўніка;

*вызначаць час дзеяслова;

вызначаць у сказе дзейнік і выказнік, называць дадаными члены сказа;

*знаходзіць словазлучэнні ў сказе;

*вызначаць, простым ці складаным з'яўляецца сказ;

вызначаць асноўную думку тэксту, дзяліць тэкст на часткі;

пісаць пераказ тэксту па калектыўна складзеным плане (*40—50 слоў, *#30—40 слоў*);

пісаць невялікі ліст родным, знаёмым, віншавальную паштоўку, тэлеграму;

пісаць пад дыктоўку тэкст (*55—60 слоў, *#30—40 слоў*) з вывучанымі арфаграмамі і знакамі прыпынку ў канцы сказа.

## VIII клас
## (105 гадзін, 3 гадзіны на тыдзень)

**Паўтарэнне** (12 гадзін). Гукі і літары. Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы.

*Будова слова. *#Роднасныя словы. Корань слова.*

*Галоўныя і даданыя члены простага сказа.

*#Віды сказаў па інтанацыі і мэце выказвання.*

**Маўленне** (2 гадзіны). Адрозненне дыялагічнага і маналагічнага маўлення. Практыкаванні ў складанні дыялогаў розных відаў.

**Тэкст** (10 гадзін). Вызначэнне тэмы, асноўнай думкі тэксту. Часткі тэксту. Назва і план тэксту. Пераказ тэксту.

Напісанне запіскі, нататкі, аб’явы.

*Складанне апавядання (вуснага і пісьмовага) на дадзеную тэму, па сюжэтнай карціне, пра выпадак са свайго жыцця, пра дзейнасць людзей, пра з’явы прыроды. Складанне апісання (рэчы, расліны, жывёлы, чалавека).

*#Складанне апавядання па апорных словах і словазлучэннях, па пачатку або яго канцоўцы.*

**Сказ** (9 гадзін).*Простыя сказы (неразвітыя і развітыя). Складаныя сказы. Коска паміж часткамі складанага сказа. Злучнікі паміж часткамі складанага сказа.

*Аднародныя члены сказа. Коска паміж аднароднымі членамі сказа без злучнікаў. Злучнікі паміж аднароднымі членамі і знакі прыпынку пры іх. Пераклад сказаў з рускай мовы на беларускую і наадварот.

*#Галоўныя і даданыя члены сказа. Сувязь слоў у сказе. Словазлучэнне.*

**Слова. Значэнне слова** (7 гадзін).Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Сінонімы. Антонімы.

**Часткі слова** (8 гадзін). *Роднасныя словы. Формы слова і роднасныя словы.

*Прыстаўкі і прыназоўнікі, іх правапіс.

*#Будова слова. Знаходжанне частак слова. Правапіс **прыставак аб-, ад-, над-, пад-, перад-**. Апостраф пасля прыставак.*

**Часціны мовы. Назоўнік** (24 гадзіны).Змяненне назоўнікаў па ліках. Назоўнікі, якія не змяняюцца па ліках: *шахматы, барацьба* і інш. Род назоўнікаў. Адрозненне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах (*сабака, гусь, медаль* і інш.).

*Значэнне склонаў і склонавыя пытанні. 1, 2, 3-е скланенні назоўнікаў.

*#Склоны і склонавыя пытанні назоўнікаў.*

**Прыметнік** (15 гадзін). Змяненне прыметнікаў па родах (у адзіночным ліку) і ліках.

Змяненне прыметнікаў па склонах. Залежнасць гэтых катэгорый прыметніка ад назоўніка, з якім ён звязаны па сэнсе.

**Асабовыя займеннікі** (4 гадзіны). Агульнае паняцце. Знаходжанне займеннікаў у сказе, тэксце. Падстаноўка прапушчаных займеннікаў.

**Дзеяслоў** (9 гадзін). *Лік дзеяслова. Змяненне дзеясловаў па часах. Неазначальная форма дзеяслова.

*#Праваіс **не** з дзеясловамі. Змяненне дзеясловаў па часах.*

**Паўтарэнне вывучанага за год** (5 гадзін).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VIII КЛАСА:

Вучні ўмеюць:

падбіраць да дадзеных слоў сінонімы, антонімы;

адрозніваць формы слова і роднасныя словы, вызначаць часткі слова; утвараць новыя словы з дапамогай прыставак і суфіксаў;

вызначаць род, лік, склон, *скланенне назоўнікаў;

змяняць прыметнікі па родах, ліках, склонах у залежнасці ад формы назоўніка;

знаходзіць у сказах асабовыя займеннікі;

вызначаць час дзеяслова і змяняць дзеясловы па часах;

*вызначаць дзеясловы ў неазначальнай форме;

*адрозніваць простыя (развітыя і неразвітыя) і складаныя сказы; ставіць неабходныя знакі прыпынку ў складаным сказе і пры аднародных членах сказа;

*#знаходзіць у простым сказе галоўныя і даданыя члены, словазлучэнні*;

складаць план тэксту; пісаць пераказ тэксту (*50—70 слоў, *#40—45 слоў*);

*пісаць невялікія навучальныя сачыненні — апавяданні і апісанні — на зададзеную тэму, па сюжэтнай карціне, пра выпадак са свайго жыцця, пра дзейнасць людзей, пра з’явы прыроды, рэчы, расліны, жывёл, чалавека;

*#пісаць невялікае навучальнае сачыненне па апорных словах і словазлучэннях, па пачатку або канцоўцы*;

пісаць запіску, нататку, аб'яву;

пісаць пад дыктоўку тэкст (аб'ёмам *50—70 слоў, *#40—50 слоў*) з вывучанымі арфаграмамі і знакамі прыпынку ў канцы сказа.

## IX клас
## (105 гадзін, 3 гадзіны на тыдзень)

**Паўтарэнне** (12 гадзін). Часткі слова. Аднакаранёвыя словы. Корань, канчатак, прыстаўка, суфікс. Апостраф пасля прыставак. Правапіс прыставак ***аб-, ад-, над-, пад-, перад-***. *Адрозненне прыставак ад прыназоўнікаў.

Часціны мовы. Род, лік, склон назоўнікаў. *Тры скланенні назоўнікаў.

Змяненне прыметнікаў па ліках, родах (у адзіночным ліку), склонах.

Змяненне дзеясловаў па часах. *Неазначальная форма дзеяслова.

**Маўленне** (9 гадзін). Мова і маўленне. Значэнне маўлення ў жыцці чалавека.

Вуснае і пісьмовае маўленне. Асаблівасці выкарыстання вуснага і пісьмовага маўлення.

Вуснае маўленне. Правілы вуснага маўлення. Маўленчы этыкет. Выкарыстанне ў зносінах мімікі і жэстаў. Дыялог і маналог.

Пісьмовае маўленне. Асаблівасці пісьмовага маўлення. Правілы пісьмовага маўлення.

**Тэкст** (12 гадзін). Часткі тэксту: пачатак, асноўная і заключная часткі. Падзел тэксту на часткі. Складанне плана тэксту.

*Тыпы тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне.

Падрабязны, сціслы, *выбарачны пераказ. Складанне водгука на прачытаны твор.

Сачыненне-апавяданне пра выпадак з жыцця, пра дзейнасць людзей, пра з’яву прыроды, сачыненне па сюжэтнай карціне. Сачыненне-апісанне (пакоя, вуліцы, надвор’я).

Афармленне афіцыйных папер. Напісанне аб’явы, заявы, распіскі, даверанасці.

*Пераклад невялікіх мастацкіх тэкстаў даступнага зместу з рускай мовы на беларускую і наадварот.

**Сказ** (15 гадзін). Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік. Даданыя члены сказа.

*#Вызначэнне словазлучэнняў у сказе.*

*Простыя і складаныя сказы. Знакі прыпынку паміж часткамі складанага сказа. Злучнікі ў складаным сказе.

*Аднародныя члены сказа са злучнікамі і без іх. Коска пры аднародных членах сказа.

*#Паняцце пра аднародныя члены сказа. Коска ў сказах з аднароднымі членамі.*

Зваротак. Знакі прыпынку пры звароткý.

**Слова. Лексічнае значэнне слова** (12 гадзін). Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. *Амонімы.

**Часціны мовы. Назоўнік** (12 гадзін). Назоўнік у ролі звароткa. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Вялікая літара ва ўласных назвах. Адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі.

*Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1, 2, 3-га скланенняў і назоўнікаў у множным ліку.

*#Скланенне назоўнікаў у адзіночным (без вылучэння тыпаў скланенняў) і множным ліку.*

**Прыметнік** (8 гадзін). Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў у адзіночным і множным ліку. Скланенне прыметнікаў у адзіночным і множным ліку.

**Асабовыя займеннікі** (6 гадзін). Займеннікі 1, 2, 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку. Выкарыстанне займеннікаў у мове**.** Змяненне асабовых займеннікаў. Асобнае напісанне займеннікаў з прыназоўнікамі.

**Дзеяслоў** (12 гадзін). *Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім і будучым часе (паняцце пра спражэнне). 1-е і 2-е спражэнне дзеясловаў. Асабовыя канчаткі дзеясловаў 1-га і 2-га спражэнняў. Змяненне дзеясловаў у прошлым часе па ліках і родах.

*#Змяненне дзеяслова па часах. Неазначальная форма дзеяслова.*

**Паўтарэнне вывучанага за год** (7 гадзін).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IX КЛАСА:

Вучні ўмеюць:

адрозніваць мову і маўленне, вуснае і пісьмовае маўленне;

правільна карыстацца вусным і пісьмовым маўленнем у розных сферах і сітуацыях зносін;

*адрозніваць тыпы тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне;

*#вызначаць часткі тэксту, складаць план тэксту*;

рабіць пераказ тэксту; пісаць навучальнае сачыненне (*водгук на прачытаны твор, сачыненне пра выпадак з жыцця, пра працоўную дзейнасць людзей, апісанне рэчаў, раслін, жывёл, пакоя, вуліцы, надвор’я, чалавека; *#па сюжэтнай карціне, пра з’яву прыроды*);

пісаць пад дыктоўку тэкст (*75—85 слоў, *#50—60 слоў*);

*перакладаць з беларускай мовы на рускую і наадварот невялікі тэкст (30—40 слоў);

пісаць даверанасць, аб’яву, заяву, распіску, запіску, ліст родным і знаёмым, тэлеграму і інш.;

*адрозніваць простыя і складаныя сказы;

вызначаць у сказе: галоўныя і даданыя члены, словазлучэнні, аднародныя члены, зваротак;

адрозніваць словы з прамым і пераносным значэннем, адназначныя і мнагазначныя, сінонімы, антонімы, *амонімы;

знаходзіць у тэксце, сказе словы вывучаных часцін мовы і характарызаваць іх у адпаведнасці з вывучанымі граматычнымі катэгорыямі.

**X клас**

**(70 гадзін, 2 гадзіны на тыдзень)**

**Паўтарэнне** (8 гадзін). Лексічнае значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. *Амонімы.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Зваротак.

**Маўленне** (6 гадзін). Мова і маўленне. Вуснае і пісьмовае маўленне, асаблівасці іх выкарыстання. Сродкі выразнасці вуснага маўлення: інтанацыя, тэмп, тон, дыкцыя, паўза, лагічны націск і інш. Перадача думак, інфармацыі пісьмовым маўленнем. Культура маўленчых зносін паміж людзьмі. Дыялог і маналог.

**Тэкст** (8 гадзін). *Тыпы тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне.

Падрабязны, выбарачны, сціслы пераказ гэтых тыпаў тэкстаў. Складанне водгуку аб прачытаным творы. Сачыненне-апавяданне пра выпадак з жыцця. Сачыненне-апісанне пейзажнай карціны. Сачыненне пра з'явы прыроды. Сачыненне-разважанне пра будучую прафесію, аб сям'і, дамашняй гаспадарцы і інш.

*#Падзел тэксту на часткі, складанне плана, падбор загалоўка. Пераказ тэксту.*

*Сачыненне па сюжэтнай карціне, сачыненне пра ўдзел у грамадскакарыснай працы.*

Пераклад з рускай мовы на беларускую і наадварот невялікіх навукова-папулярных і дзелавых тэкстаў, *#сказаў.*

Афармленне розных афіцыйных дзелавых папер: заявы, распіскі, даверанасці, аўтабіяграфіі, асабістага лістка па ўліку кадраў і інш.

**Сказ** (10 гадзін) (паўтарэнне і абагульненне раней вывучанага). Віды сказаў. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Вызначэнне словазлучэнняў у сказе.

Аднародныя члены сказа са злучнікамі і без іх. Коска паміж аднароднымі членамі сказа.

Сказы са звароткам: знаходжанне такіх сказаў у тэксце і складанне іх.

*Складаныя сказы са злучнікамі і без іх. Коска паміж часткамі складанага сказа. Сказы з простай мовай.

**Слова** (6 гадзін).Часткі слова (паўтарэнне і абагульненне).

*Складаныя словы; правапіс ***о, а, е, ё, я*** ў складаных словах. Складанаскарочаныя словы. Правапіс складаных слоў.

**Часціны мовы** (18 гадзін).Назоўнік, прыметнік, займеннік, дзеяслоў (у межах вывучанага раней).

**Лічэбнік** (6 гадзін). Агульнае значэнне, пытанні, на якія адказвае. Роля лічэбніка ў мове.

*Колькасныя і парадкавыя лічэбнікі. Лічэбнікі простыя, складаныя і састаўныя.

Правапіс лічэбнікаў.

**Прыслоўе** (4 гадзіны). Агульнае паняцце, роля ў сказе. Правапіс некаторых прыслоўяў.

**Паўтарэнне вывучанага за год** (4 гадзіны).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ X КЛАСА:

Вучні ўмеюць:

валодаць маўленчым этыкетам, сродкамі выразнасці вуснага маўлення, выказваць думку з дапамогай пісьмовага маўлення;

*адрозніваць і ствараць тэксты розных тыпаў;

*пераказваць тэксты, пісаць невялікія навучальныя сачыненні;*

перакладаць тэксты, #*сказы* з рускай мовы на беларускую і наадварот;

афармляць розныя віды афіцыйных папер;

адрозніваць і характарызаваць: сказы розных тыпаў і відаў, словы розных часцін мовы, часткі слова.